разуменнем ставіцца і сам студэнт, павінна адыгрываць не толькі ролю фармальнай справаздачы, але і несці ў сабе змястоўны імпэт, мэта якога даць найбольш значны накірунак развіццю здольнасцей студэнта. Увядзенне сістэмы тэстаў у навучальны працэс -- з'ява ў сучаснай міжнароднай практыцы не новая. У многіх краінах, асабліва ў вышэйшых школах, складалася сістэма рэйцінгавых адзнак, якія дазваляюць вельмі проста вылучаць сярод студэнтаў лепшых. Гэта тыя, хто набраў самы высокі бал па сістэме заданняў, выконваемых на розных курсах.

Зразумела, што пераход да такой сістэмы ацэньвання ведаў патрабуе ад выкладчыка дадатковай працы: спачатку трэба распрацаваць тэст і ўвесці яго ў дзеянне, а затым кожны год узнаўляць яго змест, а можа -- і форму. Гэта больш складаная работа ў параўнанні з састаўленнем экзаменацыйных білетаў. Фармуляванне пытанняў і заданняў тэстаў, вывядзенне балаў па адказах на іх арыентуе выкладчыка на ўлік тых патрабаванняў да ведаў студэнта, якія актуальны менавіта сёння, а яшчэ больш актуалізуецца заўтра. Адсюль першая выснова -- выкладчык, які працуе з тэстамі, павінен штодзённа ўзнаўляць і свае веды, суадносіць іх са зменлівай рэчаіснасцю.

Па-другое, распрацоўка тэстаў і работа па іх, калі яна будзе планавацца ў гадзінах нагрузкі, можа быць лёгка падлічана і ацэнена, у адрозненне ад часта напалову міфічнай вучэбна-метадычнай работы. І, галоўнае, студэнт з самага пачатку будзе ведаць, што ад яго патрабуюць і за якую работу ён атрымае тую ці іншую адзнаку. Першае дазволіць студэнту больш разумна планаваць сваю вучэбную работу, а другое будзе вучыць студэнта быць памяркоўным у ацэнцы сваіх магчымасцей на кожным з этапаў навучання. Гэта апошняе дазволіць самому студэнту і ўсвядоміць граніцы сваіх здольнасцей, і намеціць план і накірунак іх развіцця, і усё гэта ён будзе рабіць «амаль што сам», без празмернага ўмяшання настаўніка-ментара. Такая актыўная самастойнасць у навучанні, не фарміраванне праз сістэму тэставых заданняў з'яўляецца не менш значнай, чым атрыманыя ў навучальнай установе веды.

**Жарыкава А.А.,**
**ст.выкладчык**

## ПРЫЁМЫ АКТЫВІЗАЦЫІ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ НА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАХ

У сучаснай адукацыі важнае месца займае тэхналогія навучання. Яна ўключае мэты, змест, формы і сродкі навучання, узаемасувязі выкладчыкаў і студэнтаў. Гэта важны кампанент сумеснай дзейнасці выкладчыка і студэнта. Асноўнымі момантамі тэхналогіі навучання з'яўляюцца: пастаноўка мэт, канструяванне навучальнага працэсу, праверка эфектыўнасці работы навучальных сістэм, іх апрабацыя і распаўсюджанне. І тут галоўная задача -- бачыць асобу студэнта не толькі як аб'ект навучання і выхавання, але і як суб'ект. У такой сітуацыі пазнавальная дзейнасць студэнта выступае як дзейнасць актыўнага самастойнага чалавека. Мэта навучання скіравана на інтэлектуальнае, эмацыянальнае і асобаснае развіццё студэнта, на фарміраванне ў яго самастойнасці мыслення, творчых здольнасцей. Галоўнай функцыяй выкладчыка становіцца не інфармацыйная, а функцыя кіравання пазнавальнымі працэсамі.

Значнае поле дзейнасці ў гэтым плане -- правядзенне семінарскіх заняткаў. Поспех навучальнай дзейнасці на семінарскіх занятках у многім залежыць ад выкарыстання тых ці іншых метадаў і ад арганізацыйных форм работы падчас іх правядзення. Сёння перад выкладчыкамі і студэнтамі ўзнікае шмат складанасцей пры вывучэнні розных прадметаў, у тым ліку і культуралогіі. Адна з такіх складанасцей -адсутнасць належнай літаратуры ў бібліятэцы універсітэта. Таму тэмы семінарскіх заняткаў студэнты атрымліваюць загадзя, каб мець час папрацаваць у Нацыянальнай бібліятэцы РБ.

Сёння недастаткова пры правядзенні заняткаў абмяжоўвацца схемай «пытанне-адказ». Трэба шукаць, выпрабоўваць розныя метады атрымання ведаў студэнтамі. У прыватнасці, на другім курсе ФБІС даволі паспяхова і цікава праходзілі заняткі ў тым выпадку, калі студэнты дзяліліся на дзве



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падгрупы і адны асвятлялі пытанні, а другія аналізавалі адказы, рабілі заўвагі, ацэньвалі. Такі метад мае значныя перавагі. Па-першае, амаль уся група рыхтуецца да заняткаў, па-другое, гэта прывучае ўважліва слухаць, па-трэцяе, на кожным занятку ўзнікае дыскусія і інш.

Іншы раз даволі эфектыўным з'яўляецца правядзенне пісьмовых апытанняў па вывучаных тэмах. Потым студэнты мяняюцца сваімі работамі, аналізуюць, выстаўляюць адзнакі. У выкладчыка ў такім выпадку ёсць магчымасць праверыць веды па некалькіх тэмах.

Мэтазгодна таксама даваць творчыя заданні па падгрупах ці індывідуальна. Рабіць гэта трэба загадзя. Асабліва спрыяльныя для гэтага задання тэмы па гісторыі культуры. Студэнты многіх груп з задавальненнем рыхтавалі рэфераты па антычнай культуры, культуры эпохі Адраджэння, па творчасці мастакоў розных эпох і накірункаў. Тэмы яны выбіралі па жаданню ,і гэта значна павялічвала цікавасць да прадмета.

Выкарыстанне разнастайных форм апытання, сувязь з іншымі прадметамі, улік індывідуальных асаблівасцей студэнтаў спрыяе глыбокаму засваенню ведаў, усебаковаму развіццю асобы.

**Стрыжонак І.М.,**
**ст.выкладчык**

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ КУРСА «БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА: ТЭОРЫЯ»

Навучыць студэнта вучыцца – адна з асноўных мэт, сэнс перабудовы вышэйшай школы, рэалізацыя якой залежыць і ад таго, наколькі паспяхова вырашаюцца пытанні развіцця творчых здольнасцей студэнтаў у працэсе іх навучання ва універсітэце. Такі падыход патрабуе пэўнай арганізацыі вучэбнага працэсу, які б садзейнічаў развіццю пазнавальных здольнасцей студэнтаў, іх творчай актыўнасці і самастойнасці ў мысленні. Шляхі развіцця творчых здольнасцей бачацца ва ўдасканаленні такіх арганізацыйных форм навучання, як семінары-дыскусіі, практычныя заняткі, самастойная праца студэнтаў. У ходзе семінара-дыскусіі, які арганізуецца як працэс дыялогавых зносін удзельнікаў, адбываецца фарміраванне практычнага вопыту сумеснага ўдзелу ў абмеркаванні і вырашэнні тэарэтычных праблем, фарміраванне тэарэтыка-практычнага мыслення будучага спецыяліста. Так, перш чым удзельнічаць у рабоце семінара па тэме «Бібліятэказнаўства ў сістэме навук», студэнты знаёмяцца з крыніцамі, якія ілюструюць эвалюцыю поглядаў і меркаванняў спецыялістаў наконт статусу бібліятэказнаўства ў сістэме навук. У час семінара студэнты выказваюць розныя пункты погляду на праблему, потым, з дапамогай выкладчыка, сумеснымі намаганнямі ствараецца адзіны пункт погляду на суадносіны бібліятэказнаўства з іншымі навуковымі дысцыплінамі. У час семінара студэнт вучыцца дакладна выказваць думкі, актыўна абараняць свой пункт погляду, аргументавана пярэчыць, абвяргаць памылковую пазіцыю сакурсніка. Усё гэта абумоўлівае высокі ўзровень яго інтэлектуальнай і асабістай актыўнасці, спрыяе развіццю творчых здольнасцей. Цікава праходзяць семінары-дыскусіі з элементамі «мазгавога штурму» па тэме «Бібліятэка і грамадства»: студэнты прапануюць розныя ідэі адносна месца і ролі бібліятэк у сучасным грамадстве, у сістэме сацыяльных камунікацый, потым сумеснымі намаганнямі выдзяляюцца галоўныя моманты (дзейнасць бібліятэк ва ўмовах рыначнай эканомікі), якія абмяркоўваюцца, развіваюцца; ідзе пошук шляхоў іх рэалізацыі.

Галоўнай умовай выканання практычных заняткаў па курсу з'яўляецца самастойная пазнавальная дзейнасць студэнтаў, якая садзейнічае развіццю іх творчасці. Мэта такіх заняткаў – набыццё ведаў, навыкаў, уменняў даследчай дзейнасці будучых бібліятэкараў, якая стала важным кампанентам практычнай бібліятэчнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ